Мастацка-эстэтычная спецыфіка і жанравая дыфузія прозы Людмілы Рублеўскай у кантэксце сучаснага беларуска-англійскага літаратурнага працэсу

СУЧАСНЫ ЛІТАРАТУРНЫ ПРАЦЭС, ПРОЗА, БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА, АНГЛІЙСКАЯ ЛІТАРАТУРА, МАСТАЦКА-ЭСТЭТЫЧНАЯ СПЕЦЫФІКА, ЖАНРАВЫ ДЫЯПАЗОН, РОДАВА-ЖАНРАВАЯ ДЫФУЗІЯ, ПОСТМАДЭРНІЗМ, ГАТЫЧНЫЯ ТРАДЫЦЫІ, БЕЛЕТРЫЗАЦЫЯ АПОВЕДУ

Мастацка-эстэтычная спецыфіка і жанравая дыфузія прозы Людмілы Рублеўскай у кантэксце сучаснага беларуска-англійскага літаратурнага працэсу [Тэкст]: Справаздача аб НДР (заключ.): / БДПУ; кіраўн. Рак М.С. - Мн., 2020. - 53 с., 1 дадатак - Бібліягр.: С. 68 (61 назв.). - № ДР 20200544.

**Аб’ект:** празаічныя творы Л. Рублеўскай, У. Караткевіча, Д. Сэтэрфілд, А. Мёрдак, Д. Роўлінг.
**Мэта:** вызначэнне фактараў і спосабаў мадэрнізацыі паэтыкі і раскрыццё спецыфікі жанравай дыфузіі ў беларускай і англійскай літаратуры (проза Л. Рублеўскай, У. Караткевіча, Д. Сэтэрфілд, А. Мёрдак, Д. Роўлінг).
**Метады.** Метадалогія даследавання грунтуецца на сістэмна-тыпалагічным, комплексным падыходах, кампаратыўным, параўнальна-гістарычным, тыпалагічным, герменеўтычным метадах аналізу мастацкіх з’яў і фактаў, а таксама метадах постструктуралізму, рэцэптыўнай эстэтыкі, міфалагічнай крытыкі. Названыя падыходы прадстаўлены ў работах айчынных і замежных даследчыкаў: В. Бароўкі, Г. Бутырчык, Я. Гарадніцкага, У. Гніламёдава, Ж. Дэрыды, Г. Кісліцынай, Ю. Крысцевай, Т. Куна, Ю. Лотмана, Е. Лявонавай, В. Рагойшы, Ю. Тынянава, В. Халізева, В. Шклоўскага, І. Шаблоўскай, І. Штэйнера, Р. Якабсона і інш.
**Вынікі:** выяўлены асаблівасці паэтыкі беларускай і англійскай прозы мяжы стагоддзяў у аспекце белетрызацыі наратыўных прыёмаў; даследаваны жанравы сінкрэтызм беларускай і англійскай прозы ва ўмовах міжкультурных камунікацый; выяўлены асаблівасці рэцэпцыі гатычнай традыцыі ў прозе У. Караткевіча, Л. Рублеўскай, Д. Сэтэрфілд, А. Мёрдак; вызначэна постмадэрнісцкая скіраванасць і ўстаноўлена інтэртэкстуальнае ўзаемадзеянне ў сучаснай беларускай і англійскай прозе, падрыхтаваны рукапіс манаграфіі (тэкст якога пакладзены ў аснову справаздачы).
**Ступень укаранення.** Вучэбны працэс БДПУ.
**Вобласць выкарыстання**: напрацоўкі выкарыстоўваюцца непасрэдна ў вучэбным працэсе пры чытанні лекцый, правядзенні практычных заняткаў па «Гісторыі беларускай літаратуры», «Сучасным літаратурным працэсе», «Сусветным літаратурным працэсе», «Параўнальным літаратуразнаўстве» і «Тэорыі літаратуры», могуць быць выкарыстаны таксама і настаўнікамі на ўроках беларускай літаратуры і замежнай мовы.